З першых вуснаў

# «Трэба для сябе і сваіх людзей вырабіць вакцыну»

## Прэзідэнт, наведваючы 4-ю бальніцу Мінска, падзяліўся планамі па вытворчасці айчыннай вакцыны супраць ковіду

**Чацвёртая гарадская клінічная бальніца імя М. Саўчанкі мае 60-гадовую гісторыю. З гэтай медыцынскай установай звязанае станаўленне айчыннай уралогіі, укараненне новых тэхналогій у лячэнні сардэчна-сасудзістых захворванняў РНПЦ «Кардыялогія». Вядомая «чацвёрка» і за межамі Беларусі перадусім сваім аддзяленнем пластычнай і эстэтычнай хірургіі. Але сёння асаблівая ўвага ў Прэзідэнта не справам сардэчным і не прыгажосці — ён зноў у «чырвонай» зоне знаёміцца з лячэннем хворых на ковід.**

### ПРАЗ КОВІД НЕ ЗАБЫВАЦЬ ПРА ІНШЫХ

Галоўны ўрач бальніцы Вацлаў Янушка праінфармаваў, што ўсяго ў клініцы амаль 900 ложкаў, 70 % з якіх аддадзены ковід-хворым. Бальніца ў гэты час аказвае разнастайныя паслугі і па сваім профілі, але ў меншай ступені.

***«Мы павінны разумець, што акрамя пацыентаў з каранавірусам ёсць і іншыя: сардэчна-сасудзістыя, дыябетычныя і анкалагічныя. Таму вы робіце правільна, дапамагаючы людзям з іншымі захворваннямі,*** — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Самае галоўнае — утрымацца на гэтых ложках. Непажадана пашыраць».

Па яго меркаванні, пацыенты не павінны знаходзіцца ў лячэбных установах, калі яны выздаравелі. «Калі чалавек лечыцца дома, ён адчувае сябе камфортней і хутчэй здаравее. Справа не ў тым, што мы павінны выціскаць людзей, але калі дынаміка добрая, чалавек ідзе на выздараўленне, нельга яго трымаць. Па статыстыцы, 0,31 працэнта людзей (нават працэнту няма) даводзіцца вяртаць назад. Гэта добры паказчык, значыць, створана добрая сістэма, пажадана яе захаваць, каб анкалагічныя ложкі не перапрафілявалі пад ковід», — паведаміў Прэзідэнт.

Ён адзначыў, што расійскія ўрачы прагназуюць у найбліжэйшыя гады ўсплёск анкалогіі ў сваёй краіне: на фоне пандэміі прафілактычных мер прымаецца менш.

***«Мы павінны ўважліва сачыць за гэтым пытаннем. Неабходна абследаваць насельніцтва, каб своечасова выявіць злаякасныя пухліны і іншыя захворванні»,*** — акцэнтаваў увагу Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнту далажылі, што да канца тыдня будзе адкрыта 290 ложкаў на далечванне хворых з ковід-інфекцыяй у гарадскім скурна-венералагічным дыспансеры. Зараз такіх пацыентаў бяруць Рэспубліканская клінічная бальніца медыцынскай рэабілітацыі ў Аксакаўшчыне і Рэспубліканскі шпіталь інвалідаў. Там усяго месціцца 891 ложак.

### ЗМАГАННЕ ЗА ЗДАРОЎЕ ЦІ ЗА ГРОШЫ?

Традыцыйную размову з калектывам падчас візіту ў бальніцы Прэзідэнт пачаў са слоў падзякі. ***«Вялікі дзякуй за тое, што трываеце. Галоўнае — трываць.*** Я ведаю, ёсць цяжкія хворыя. Калі нешта трэба, нечага не хапае, вы менш у «брудных халатах» (маецца на ўвазе тэлеграм-канал медыкаў. — **«Зв.»**) пішыце, а звяртайцеся наўпрост», — сказаў Прэзідэнт.

Медыкі пацікавіліся, калі плануецца вакцынацыя насельніцтва. Кіраўнік дзяржавы расказаў, што на выпрабаваннях знаходзіцца расійская вакцына, але ніхто не дае 100 % выніку ад яе ўвядзення. Ён адзначыў, што ў краіне ўжо ёсць выпадак, калі прышчэплены захварэў на ковід, але не ў цяжкай форме.

Прэзідэнт праінфармаваў, што цяпер разглядаюцца тры асноўныя варыянты супрацьдзеяння распаўсюджванню інфекцыі з дапамогай вакцынацыі: закупка расійскай вакцыны, арганізацыя ў Беларусі вытворчасці вакцыны з расійскага штаму, а таксама распрацоўка ўласнай вакцыны.

«У чацвер абмяркуем, якім шляхам будзем рухацца. Вы ж разумееце, вытворчасць вакцын — справа нятанная, але і па часе доўгая. Вакцыну не атрымаеш за некалькі месяцаў, калі будзеш сваю распрацоўваць, нават вытворчасць сваю наладзіць не так проста, нават калі база ў цябе ёсць», — зазначыў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт не выключае, што давядзецца задзейнічаць усе тры прапанаваныя варыянты.

***«Нам трэба будзе купіць вакцыну, каб тэрмінова прышчапіць групу рызыкі (гэта ўрачы і медсёстры перш за ўсё). Нам нядрэнна было б наладзіць вытворчасць. Справа нават не ў тым, што мы потым зможам прадаць яе, але трэба для сябе і сваіх людзей вырабіць вакцыну. Таму пойдзем усімі гэтымі напрамкамі. І калі напрацоўкі нашых навукоўцаў акажуцца сур'ёзнымі, будзем займацца ўласнай вакцынай»,*** — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт паведаміў, што вытворчасць уласнай вакцыны важная, бо ён перакананы: каранавірусная інфекцыя застанецца назаўсёды.

***«Таму нам патрэбна будзе вакцына. І не толькі сёння-заўтра, але і паслязаўтра,*** — патлумачыў кіраўнік дзяржавы. ***— Калі мы навучымся вырабляць самі, атрымаем вопыт, значыць, у нас будуць добрыя спецыялісты, навукоўцы, добрыя медыкі, і ахова здароўя такім чынам будзе развівацца. Наогул біятэхналогіі — гэта вялікая перспектыва».***

Прапановы па вырабе ўласнай вакцыны агучылі спецыялісты з Віцебска і навукоўцы з Нацыянальнай акадэміі навук.

Прэзідэнт звярнуў увагу, што ў свеце цяпер вядзецца барацьба за распрацоўку і вытворчасць вакцыны. «Мяне што насцярожвае ў гэтай вакцыне — бойка за грошы. У гэтым круціцца мільярды долараў, і ўсе пачалі біцца за гэтыя грошы, часам грэбуючы адказнасцю і за вакцыну, і тых людзей, якія ў дадзеным выпадку на выпрабаваннях», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Каментарый у тэму

### Беларусь выйшла на пік пнеўманій і пратрымаецца на ім як мінімум паўтара месяца

**Пра гэта заявіў журналістам у 4-й бальніцы Мінска міністр аховы здароўя Дзмітрый ПІНЕВІЧ.**

«Мы выйшлі на пік па ўсіх рэгіёнах. На жаль, паказчыкі досыць высокія. Мы мяркуем, што каля паўтара месяца будзем на такіх высокіх лічбах», — сказаў міністр. Ён дадаў, што «гэтае плато магло быць вышэйшым».

Асноўным паказчыкам эпідпрацэсу для медыкаў з'яўляецца не колькасць хворых, а аналіз паступлення людзей з пнеўманіяй, асабліва ковіднай, растлумачыў міністр.

Дзмітрый Піневіч нагадаў, што ў краіне распрацавана шматузроўневая сістэма аказання дапамогі — інтэнсіўнае лячэнне на ложках кароткачасовага знаходжання і перавод на далечванне амбулаторна альбо стацыянарна.

«Калі з'явіцца неабходнасць, будуць задзейнічаны і некаторыя санаторыі, дзе асабліва сталыя нашы грамадзяне праходзяць кароткія курсы санаторна-курортнага лячэння, замацоўваючы станоўчы эфект. То-бок у нас працуюць усе звёны ланцуга, нягледзячы на тое, што нагрузка вышэйшая, чым у вясновую хвалю», — дадаў Дзмітрый Піневіч.

Міністр падкрэсліў, што, нягледзячы на высокую нагрузку на сістэму аховы здароўя з-за пандэміі, у краіне не перасталі аказваць спецыялізаваныя віды медыцынскай дапамогі, але зменена іх маршрутызацыя — пацыенты перанакіраваны ў буйныя рэспубліканскія цэнтры, якія не перапрафілявалі пад ковід-інфекцыю.

Дзмітрый Піневіч заўважыў, што пандэмія не скончыцца заўтра. «Як мінімум да чэрвеня мы будзем жыць з высокай інтэнсіўнасцю, пакуль штам не стане сезонным», — рэзюмаваў ён.

**Вацлаў ЯНУШКА, галоўны ўрач 4-й гарадской клінічнай бальніцы імя М. Саўчанкі,** сцвярджае, што галоўнае ў паўсядзённай працы медыкаў — аказанне кваліфікаванай медыцынскай дапамогі.

«Мы сёння на 70 працэнтаў перапрафіляваны і аказваем у кругласутачным рэжыме пацыентам з ковід-інфекцыяй дапамогу. Прычым мы аказваем таксама дапамогу пацыентам Мінска з вострай хірургічнай паталогіяй, пацыентам з вострым каранарным сіндромам, а таксама пацыентам нефралагічнага профілю», — расказаў журналістам медык.

Як паведаміла **старшыня камітэта па ахове здароўя Мінгарвыканкама Жанна КАЗАЧОНАК,** у сталіцы не спынілася аказанне планавай дапамогі ў паліклініках. Адбылося толькі яе пераразмеркаванне сярод амбулаторных медыцынскіх устаноў.

«На сябе гэтую функцыю ўзялі эндакрыналагічны дыспансер, тры афтальмалагічныя цэнтры (у 10-й, 11-й і 3-й гарадскіх клінічных бальніцах). Лор-дапамогу аказвае кансультатыўны цэнтр 4-й і 11-й бальніцы. Планавая дапамога аказваецца своечасова», — сказала Жанна Казачонак. Яна дадала, што ў поўным аб'ёме лечацца пацыенты ў стацыянары анкалагічнага дыспансера.

**Марыя ДАДАЛКА.**

Добрая навіна

## 20-я, адноўленая

**У Мінску пасля капітальнага рамонту ўчора ўрачыста адкрылі 20-ю гарадскую паліклініку. Абноўленая ўстанова аховы здароўя ў Фрунзенскім раёне сталіцы ў змену зможа прымаць больш за 700 чалавек, перадае карэспандэнт БелТА.**



Фота БелТА.

Як адзначыла **старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА,** якая прысутнічала на адкрыцці, у гэтым годзе з'яўленне новых і рэканструкцыя дзеючых медустаноў як ніколі важныя. «Пытанні, якія звязаны з абслугоўваннем насельніцтва раёна, аказаннем медыцынскай дапамогі першачарговае для нас у няпросты час, якая склалася з-за каранавіруснай інфекцыі. Улады горада і краіны робяць усё магчымае, каб такія медыцынскія ўстановы адкрываліся, з'яўляліся новыя аб'екты аховы здароўя і рэканструяваліся старыя для дапамогі людзям. Я хачу сказаць, што сёння паліклінічнае і амбулаторнае звяно працуе вельмі эфектыўна. А сучаснае абслугоўванне і добрыя ўмовы для пацыентаў і ўрачоў вельмі важныя, таму што людзі, іх дабрабыт і здароўе заўсёды былі і застаюцца прыярытэтным напрамкам дзяржаўнай палітыкі», — падкрэсліла Наталля Качанава.

Таксама яна нагадала, што Фрунзенскі раён — самы густанаселены ў Мінску: «Хацелася б, каб ён і далей папаўняўся новымі аб'ектамі».

Блізкая ўлада

## Рэстаўрацыя, навучанне і маладыя спецыялісты

**Міністр культуры Анатоль МАРКЕВІЧ наведаў Прыдзвінскі край, дзе азнаёміўся з ходам будаўнічых работ на шэрагу аб'ектаў, правёў нараду і прыём грамадзян.**

У самым старажытным горадзе краіны Полацку ён азнаё-міўся з ходам рэстаўрацыйных работ у Спаса-Праабражэнскім храме знакамітага далёка за межамі Беларусі праваслаўнага Спаса-Ефрасіннеўскага манастыра. Між іншым, гэтую царкву, пабудаваную ў сярэдзіне XII стагоддзя, прапануюць унесці ў Спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА.

Анатоль Маркевіч застаўся задаволены ўбачаным і выказаў упэўненасць, што ўсё неабходнае ў пытаннях рамонту і рэстаўрацыі будзе завершана згодна з планамі — у 2024 годзе. Таксама ён падкрэсліў ювелірную і дасканалую працу спецыялістаў.

А вось вялікі дзейнасці будаўнікоў у віцебскім Нацыя-нальным акадэмічным драматычным тэатры імя Якуба Коласа нельга ацаніць на «дзесяць балаў». І гэта пры тым, што грошы міністэрствам на рамонт даху вылучаюцца своечасова.

Гэты аб'ект «узяты на аловак»: патрабуе асаблівага кантролю.

У нарадзе ў аблвыканкаме ў рэжыме відэаканферэнцыі бралі ўдзел памочнік Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь — інспектар па Віцебскай вобласці Анатоль Ліневіч, намеснік старшыні аблвыканкама Уладзімір Пенін, начальнік упраўлення культуры аблвыканкама Пётр Падгурскі, дырэктары і прадстаўнікі музеяў Віцебска, устаноў культуры, прадстаўнікі кіраўніцтва выканкамаў, аддзелаў культуры.

Кожны мог задаць пытанне.

Вельмі зацікавіла адно з іх. Датычылася яно выхаванцаў дзіцячых школ мастацтваў, якія плануюць звязаць свой прафесійны лёс з творчым захапленнем, каб яны маглі б вучыцца мастацтву ажно да паступлення. А пакуль што на некалькі гадоў страчваюць «сувязь» з мастацтвам да падачы дакументаў у навучальную ўстанову.

Анатоль Ліневіч прапанаваў разгледзець магчымасць спрасціць працэдуры куплі і выкарыстання нерухомасці, якая ўяўляе гістарычную каштоўнасць. Многіх ініцыятыўных і прадпрымальных проста пужае вялікая колькасць бюракратычных працэдур, калі яны хочуць адкрыць пасля рамонту ў стагадовых будынках гатэль, рэстаран, краму і іншае. Столькі ўсяго трэба ўлічваць пры нават дробным рамонце і плацяць за афармленне папер, што лепш, як мовяць, і не ўвязвацца, — такая логіка ў тых, хто мог бы даць другое жыццё старым дамам.

Нямала ўвагі ўдзялялася падчас відэасувязі кадраваму пытанню. У многіх райвыканкамах павінны зрабіць шмат, каб моладзь пасля адпрацоўкі не з'язджала ў вялікія гарады. Галоўныя праблемы: нізкая зарплата і адсутнасць жылля.

Дарэчы, у пачатку наступнага года, дзякуючы ўвядзенню надбаўкі за спецыфіку працы для работнікаў культурна-асветніцкіх арганізацый, заробак многіх прадстаўнікоў сферы павысіцца.

Міністр таксама правёў прыём грамадзян. У прыватнасці, былі агучаны пытанні магчымасці тэндарных дзяржаўных заказаў мастакам, скульптарам, майстрам дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**